3. Гольденвейзер А.А. Правовое положенне евреев в России //Книга о русском еврействе : от 1860-х годов до революции 1917г.- Иерусалим: гешарм; М.: РПО «Мосты культуры»; МН.:000 «Мет»,2002.-с.127.
4. Лещинский Я. Еврейское население России и еврейский труд // Книга о русском еврействе от 1860-х годов до революции 1917 г.- Иерусалим: Гешарм; М.:РПО "Мосты культуры»;Мн.: 000 «Мет»,2002.-с.189.
5. Колеснева О.Еврейские рабочие Беларуси и законодательство российской империи конца XIX-начала XX веков // Евреи Беларуси: История и культура : Сб. науч. Тр./ Сост. и ред. И.П. Герасимова.-Мн.: Четыре четверти,2001 .-вып.6.-с.51.
6. Абезгаус З.Е. Рабочий класс Белоруссии в нач. XX в. (1900-1913гг).-Мн.: наука и техника, 1977.-с.38.
7. Программа политических партий России. Конец XIX-начало XX вв./ Сост. В.В. Кривенький, Н.Н. Тарасова,-М.: Росспэн,1995,-с.80.

Резюме

Статья посвящена становлению еврейского общественно-политического движения на территории Беларуси в 19-начале 20 века. Автор анализирует основные предпосылки и причины активизации еврейского общественно-политического движения в 19 веке, раскрывает специфику его генезиса в регионе в указанный период.

Summary

The article is devoted to the problem of formation of the Gewish national-political movement on Belorussian region at the end of the 19$^{th}$ century- beginning of the 20$^{th}$ century. Main reasons and preconditions of the activation of the Gewish national-political movement of the 19$^{th}$ century are analyzed by the author as well as the specific character of the political movement genesis in the region during the above period is revealed.

УДК .01.+82.081

# НАЦЫЯНАЛЬНЫ ФАКТАР І КУЛЬТУРНА-ГІСТАРЫЧНАЯ ІСНАСЦЬ У МАСТАЦКАЙ ПРОЗЕ ЯНКІ БРЫЛЯ НА МЯЖЫ XX – XXI СТАГОДДЗЯЎ

**Р.К. Казлоўскі**

УА "Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы"

г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Тып свядомасці (менталітэт) асобнага народа праяўляецца ў ягонай культурнай традыцыі і ў найбольшай ступені ў мастацкай літаратуры, якая адлюстроўвае рэаліі матэрыяльнага і духоўнага



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

жыцця нацыі ў розныя перыяды яе існавання. У творах асэнсоўваюцца гісторыя і грамадскія падзеі, настроі і памкненні простага люду і элітных груп насельніцтва. Выразнікамі духу народа і носьбітамі культурнай традыцыі становяцца выбітныя пісьменнікі сваёй эпохі, у прыватнасці для сучаснай Беларусі – Янка Брыль. Асоба пісьменніка знакавая тым, што і ў апошняе дзесяцігоддзе свайго жыцця Я. Брыль застаўся паслядоўным у сваіх мастацкіх прынцыпах, надалей працягнуў шчыра і даходліва гаварыць аб часе і аб чалавеку, што адлюстравалася ў ягонай лірычнай прозе. Творчае светабачанне любога мастака ў многім абумоўлена гістарычнай эпохай і жыццёвым вопытам, таму не новым стала тое, што, захаваўшы тонкае адчуванне прыгажосці свету, захапленне родным краем, аўтар выявіў уменне адлюстроўваць грамадска-гістарычныя праявы сучаснасці, ацаніць мастацка-культурныя каштоўнасці часу, асэнсаваць светлыя і цёмныя бакі жыцця чалавечай супольнасці, выявіць патаемныя гранкі псіхалогіі асобы.

Нацыянальнае ў творчасці асобнага пісьменніка праяўляецца ў форме і змесце. У змесце – гэта ідэйна-тэматычная накіраванасць і пэўны дыяпазон разглядаемых праблемаў. У форме – жанравая разнастайнасць твораў. Так, жанр празаічнай мініяцюры абсалютна пераважае ў творчасці Я.Брыля канца XX – пачатку XXI стагоддзяў. Малая брылёўская проза мяжы стагоддзяў, з аднаго боку, аўтабіяграфічная, самадаследчыцкая, з другога, аналітычная. Мастак даследуе культурна-гістарычную існасць, жыццё, а дакладней яго эстэтычныя ўласцівасці. Рэальнасць у пэўнай ступені па-філасоўску перайначваецца ў свядомасці пісьменніка ў эстэтычна завостраныя абразкі, і новая іншарэальнасць, дакументальная па сваім змесце, адрасавана да розуму чытача, ягонаму светаадчуванню і дзесьці носіць дыдактычны характар. Недарма паняцці хараства, дабра ва ўніверсальным разуменні маюць першаснае значэнне ў брылёўскай творчасці мяжы стагоддзяў і іх праявы асабліва адчувальныя ў мініяцюрах. Для гэтага жанру характэрны вобраз лірычнага героя, які ў большай ці меншай ступені набліжаецца да аўтара. Праз ягоны светапогляд, разуменне навакольнай рэчаіснасці разглядаюцца найбольш важныя, лёсавызначальныя падзеі гісторыі і тэндэнцыі грамадскага развіцця. Пісьменнік, як і любы чалавек, знаходзіцца ў пэўнай культурна-гістарычнай існасці, выражае інтарэсы нейкай праслойкі грамадства, а творца можа браць на сябе адказнасць гаварыць “за ўвесь народ” (у агульным разуменні). Я. Брыль заўважае, што не заўсёды ў творах апошніх гадоў мог выказацца наўпрост, дзесьці асцярожнічаў. Ён зазначае: “Бывае ў маіх паводзінах трохі, а то



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

і больш за трохі ранейшай, прысавецкай боязі ды асцярожнасці, у тым ліку і ў запісах. Лаўлю сябе на гэтым, дакараю…” [2, с. 262].

Кожны пісьменнік – яшчэ і грамадзянін сваёй дзяржавы. Але быць патрыётам у Беларусі вельмі няпроста, бо гісторыя краіны склалася такім чынам, што ў розныя эпохі мова і культура тытульнай нацыі ці забаранялася, ці не дапускалася да шырокага ўжывання, а дзесьці прыніжалася. “Даўней – хто ў лаціну, хто ў польскую, хто ў рускую мовы, бо са сваёй ходу не было” [2, с. 112]. Ідэйна-эстэтычную канцэпцыю мініяцюр Я. Брыля можна выразіць словамі: дасканалы чалавек у дасканалым грамадстве. Але не можа быць чалавек дасканалым, калі на сваёй жа роднай зямлі пагарджае мовай уласных бацькоў дзеля ілюзорнай узвышанасці ў дэнацыяналізаваным грамадстве. Гісторыя не была ласкавай да беларускага народа, цяжка ішло станаўленне дзяржаўнасці, вынішчаліся родная мова, культура, гінулі ў лагерах лепшыя прадстаўнікі нацыі. Пісьменнік асэнсоўвае праблему бяздзеяння савецкіх уладаў у накірунку падтрымання беларускай мовы і культуры ў Беларусі. Так, пра адну сустрэчу ў ЦК партыі па нацыянальным пытанні: «З аднаго боку наш прэзідыум, з другога – члены бюро і ўрада. Гаварылася многа, адкрыта. Намі, вядома... А ўсё абышлося касметыкай, абяцаннямі, і яшчэ раз ясна стала, што пытанне вырашаецца не ў рэспубліцы... Хоць новы сакратар па ідэалогіі, самападкрэслены беларус (Падкрэслена – Р.К.) Пілатовіч, які толькі што замяніў вялікага маўчуна Шауру, што за паўтара года не знайшоў часу прыняць наш прэзідыум, каб пагаварыць па тым горкім нацыянальным пытанні, здаўся нам тады на штосьці добрае надзейным.» [4, с.140-141] Нярэдка пісьменнік цытуе ўрыўкі з прачытанага, даючы кароткі каментарый альбо заўвагу, у якой з дапамогаю дэталяў, эмацыянальна-афарбаваных фразаў сказана ўсё. Напрыклад, пра польскага навукоўца: «А вышэй гэты дамарослы даследчык піша пра нас, што «прымусовая акцыя рускіх захопнікаў ператварыла іх (каталікоў – Р.К.) у беларусаў праваслаўнага веравызнання. Засталіся ў іх толькі схаваныя ў глыбіні душы ўспаміны і пэўная гордасць, што яны паходзяць з каталікоў...». Вось яно як!» [1, с. 258]

Пісьменнік відавочна разлічвае на чытача з блізкім светапоглядам, стараецца прымусіць яго задумацца над фактам, які можа быць для большасці ўрбанізаванага насельніцтва Беларусі паўсядзённым, звыклым. “На телеэкране, у перадачы ***“Роднае слова”*** (Падкрэсл. – Р.К.) кніжны кірмаш. Цэлае мора-акіян кніг, кніжак і кніжачак і ўсе такія шматкаляровыя, і ўсе на рускай мове!.. Сціплы паэт-журналіст снуе ад стала да стала, службова, з мікрафонам пытаецца, а дзе ж такія

на яшчэ адной, на карэннай дзяржаўнай мове?..” [2, с. 112] На мове нацбольшасці і тытульнай нацыі краіны кніг няма. Такія парадоксы, неадпаведнасці разумнаму сэнсу развіцця падзей сталі ўдалым матэрыялам для раскрыцця перакосаў і супярэчнасцей грамадскага развіцця ў мастацкай творчасці. Для Янкі Брыля нацыянальнае – гэта частка душы, без нацыі, без каранёў, не можа быць асобы, таму праблемам беларускасці ў розных сферах жыцця пісьменнік надае шмат увагі, а чалавек без пачуцця нацыянальнай годнасці і павагі да іншых народаў аўтарам ставіцца на ніжэйшыя прыступкі эстэтычнай лесвіцы. Напрыклад, у такой мініяцюры: “***Начальнікі*** ўсіх калібраў, слухаючы беларускія пытанні ды разважанні радыёкаментатараў, усё-ўсё разумеюць, на ўсё дакладненька адказваюць. Застаецца толькі самім таксама загаварыць, чаго – не раўнуючы, а ўслед за прымаўкай, – не могуць і ***сабакі***” [2, с. 70] (Падкрэсл. – Р.К.). У выніку мантажу з’яў розных эстэтычных узроўняў (праз параўнанне) слова “начальнікі” з сярэдне-эстэтычнага ўзроўню падае на нізкі. Такім чынам, маналагічная форма многіх мініяцюр выконвае не толькі паведамляльную задачу, але і эмацыйна-ацэначную шляхам эстэтычных су- і супрацьпастаўленняў.

Ментальнасць беларускага народа, як сродак успрымання і рэагавання, у выніку стагоддзяў ціску суседніх нацый у культурна-моўным і грамадска-палітычным кірунках сфармавала ў частцы соцыуму пэўны этнапсіхалагічны клімат. Мастацкая літаратура і раней адлюстроўвала лад і характар мыслення такога этнічнага ўтварэння як беларусы, але гэта давалася з цяжкасцю і не поўнай дакладнасцю, бо пісьменнікам прыходзілася азірацца на савецкія ідэалагічныя ўстаноўкі і нават рызыкаваць сваёй свабодай, выказваючы думкі і меркаванні наўпрост. Мініяцюра, як нейкае фармальна-зместавае цэльнае адзінства, дае магчымасць вольна філасофстваваць, пасродкам дэманстрацыі эстэтычна афарбаванай з’явы падаваць гатовую ідэю і такім чынам рабіць уплыў на грамадства, на яго свядомасць. У творчасці Я.Брыля 90-х гадоў ХХ – пачатку ХХІ стагоддзяў у ідэйна-эстэтычнай канцэпцыі шчыльна прымыкае да з’явы пачварнага трагічнае, як нешта, што прыводзіць да пагібелі ці нясе непамерныя страты. Трагедыя беларускага народа заключаецца ў непрызнанні самога факта існавання такога этнасу пэўнымі грамадска-палітычнымі сіламі як на Усходзе, так і на Захадзе. “Пачварнае” стаўленне да беларусаў праяўляецца нярэдка на навуковым і нават побытавым узроўні. Гэта тое, пра што маўчаць газеты, палітыкі, але гавораць паміж сабою звычайныя людзі і выказвае наўпрост Янка Брыль. “Універсітэцкі вахцёр, важны і строгі таварыш з загадкавых



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

адстаўнікоў, калі наведвальнікі звярнуліся да яго па-беларуску, не прыпадняўся з-за свайго службовага прыўваходнага століка, толькі сказаў: “А вы по-человечески спросить не можете?” Гэта – у Мінску. А ў Беластоку, – чытаю ў газеце “Ніва”, – маці прыехала з вёскі да гарадскога сына ў бальніцу, сядзяць, гавораць па-свойму, па-роднаму, а пані доктар падышла да іх і кажа: “No, może byście chociaż w szpitalu gadali po ludzku!” [3, с. 21]

Майстэрства пісьменніка заключаецца і ва ўменні рабіць у тэксце эстэтычны мантаж самых звычайных, на першы погляд, з’яў. Так, у мініяцюрах аўтар можа падаць 2-3 публіцыстычныя па характару паведамленні альбо назіранні аб нейкіх падзеях, звязаць іх прысутнасцю лірычнага героя назіральніка, і ў выніку эстэтычнага мантажу факты паварочваюцца перад чытачом новым незвычайным бокам, напаўняюцца агульным філасофскім зместам, а твор набывае цэльнасць. Кампазіцыя можа складацца з імгненнага ўражання і разважання, з некалькіх (ці аднаго) назіранняў і каментару.

Пісьменнік умее індывідуалізаваць персанажы з дапамогаю пэўных дэталяў у іх мове, што дае незвычайны эфект, калі ў некалькіх радках раскрываецца ўнутраны свет чалавека, яго стаўленне да жыцця і грамадства. Нярэдка ў тэксце дакладна перадаюцца словы героя, не зменена, – і ў няправільнасці, ненарматыўнасці формаў адчуваюцца якасці асобы, псіхалагічны і сацыяльны тып. У зборніку прозы „З людзьмі і сам-насам” (2003) Я. Брыля кідаецца ў вочы  ў параўнанні з іншымі, ранейшымі, што значна больш, чым калі-небудзь, аўтар падкрэслівае словы, фразы, асабліва, калі разглядае, аналізуе нейкую моўную з’яву, спрабуе асэнсаваць яе эстэтычны бок. Увогуле стваральнікам мастацка-лінгвістычнай і філалагічнай мініяцюры ў беларускай літаратуры лічыцца прафесар-мовазнаўца Фёдар Янкоўскі, які ў розныя гады сваёй прафесійнай і творчай дзейнасці збіраў народнае слова, занатоўваў маналогі, дыялогі, трапныя выразы, тыя замалёўкі мовы беларусаў, якую называюць аўтэнтычнай, без літаратурнай адшліфаванасці і асаблівай вытанчанасці. Фрагменты жывой беларускай мовы з сэнсавадакладнымі, некалькаванымі словамі падае і Я.Брыль, пры гэтым захапляючыся прыгажосцю і іншых славянскіх моваў. „Успомнілася слова ***выскрабак*** і той маленькі боханчык з рэшткі цеста ў дзяжы, гарачы і духмяны падарунак маломy ад маці… А ***выскрабак*** наш – ***колобок*** па-руску, ***chlebek*** – па-польску, яшчэ раз ***колобок***, па-ўкраінску…”[3, с. 50]

У параўнанні з папярэднім перыядам творчасці, ствараецца ўражанне, што пісьменнік менш стаў гаварыць пра смешнае, мала надае ўвагі камічнаму, на свет глядзіць больш па-філасофску сур’ёзна,

РЭПАЗІТОРЫЙ ГГАУ

аналітычна. Проза Я. Брыля канца XX – пачатку XXI стагоддзяў – не проста ўспаміны, запісы з нататніка, гэта яшчэ разважанні мэтра літаратуры над самой мастацкай літаратурай, кнігамі, лёсамі пісьменнікаў. А. Куляшоў, В. Вітка, А. Жук, В. Сёмуха, Я. Маўр… і многія іншыя. Уражанні ад твораў, успаміны аб сустрэчах, тыя жывыя кадры жыцця, якія ўжо цяпер маюць каштоўнасць пазнання ўнутранага свету людзей, на чыёй творчасці выхоўваецца ўжо каторае пакаленне моладзі. Пра ўсё ў малой лірычнай прозе. Лагічным у кампазіцыйна-жанравай канцэпцыі творчасці мяжы стагоддзяў сталі і эсэ, напрыклад, “Тры вузлы” і “Пераклічка”, прысвечаныя літаратарам і навукоўцам беларусу Фёдару Янкоўскаму і чэху Вацлаву Жыдліцкаму. Лёсы людзей, якія шмат зрабілі для беларускай літаратуры, у многім як напамін, каб не забывалі і помнілі тых, сваіх і чужых, хто ўзбагаціў пісьмовае мастацтва сваёй працай, гарэннем уласнага таленту. Хаця праз вобразы гэтых людзей найбольш вымалёўваецца ўсё ж любоў да роднага краю, беларускага люду, усяго чалавечага, агульнага для ўсёй зямной супольнасці.

У многім дзякуючы Янку Брылю, мініяцюра стала рэпрэзентатыўным жанрам беларускай літаратуры. Нацыянальная тэматыка скразной лініяй праходзіць праз творчасць канца XX – пачатку XXI стагоддзяў і праяўляецца ў выяўленні шырокага спектру праблем грамадска-культурнага і ў лучнасці з ім асабістага чалавечага жыцця.

Літаратура

1. Брыль Я. Вячэрняе: Лірычныя запісы і мініяцюры. – Мн.: Маст. літ., 1994. – 350 с.
2. Брыль Я. З людзьмі і сам-насам: Запісы, мініяцюры, эсэ. – Мн.: Маст. літ., 2003. – 334 с.
3. Брыль Я. З новых запісаў. – Полымя. – 2000. – № 11. – С. 3-30.
4. Брыль Я. Пішу як жыву: Аповесці, апавяданні, мініяцюры, эсэ. – Мн.: Маст. літ., 1994. – 363 с.

Резюме

Статья раскрывает художественную специфику национального в прозе писателя на стыке XX – XXI столетий, особенности его мировоззрения и общественной позиции, рассматриваются основные эстетические свойства художественного строя миниатюр. Подчеркивается, что эстетические со- и противопоставления в соединении со свободным философским рассуждением способствуют наиболее полному выявлению творческого замысла писателя.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Summary

The article shows artistic peculiarities of the national mentality in J.Bryl's prose at the junction of the 20th and 21st centuries. It also describes Bryl's world outlook and social stand as well as the main aesthetic characteristics of the artistic structure of miniatures. It is stressed that aeshetic comparison and contraposition alongside with free philosophic reasoning help to reveal fully the writer's creative intention.

УДК 378.147:004

# ИСПОЛЬЗОВАНИЕ ИННОВАЦИОННЫХ ПРИЕМОВ В ПРОЦЕССЕ ПРЕПОДАВАНИЯ АГРОНОМИЧЕСКИХ ДИСЦИПЛИН

**О.С. Корзун**

УО «Гродненский государственный аграрный университет»

г. Гродно, Республика Беларусь

Действующие программы предусматривают применение в обучении практических методов (занятия с обучающими машинами-компьютерами) и методов самостоятельной работы, т.е. всех видов работ, которые выполняют студенты без непосредственного руководства со стороны преподавателя. Методы контроля и самоконтроля в обучении – это прежде всего методы машинного контроля. Программа для контроля составляется по методике контрольных программированных упражнений. Ответы набираются или цифрами, или в виде формул (3).

В процессе преподавания дисциплин агрономического профиля широко используются комплекты дидактических материалов по учебным дисциплинам, в состав которых включены конспекты лекций, лабораторные практикумы, тестовые задания, списки основной и дополнительной литературы, программа и задания для учебной практики и пр.

В условиях информационной технологизации общества эффективную самостоятельную работу студентов смогут обеспечить электронные варианты изучаемых дисциплин, которые содержат учебное пособие, лабораторный практикум, подсистему тестирования. К ним относятся также словарь терминов и список литературы по изучаемой дисциплине (5).

Пробуждению интереса учащихся к учебному процессу способствует использование новых компьютерных технологий. Такой формой изложения материала являются мультимедийные лекции. Для

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ